Яўген Шунейка

кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт,
прафесар кафедры гісторыі і тэорыі мастацтваў
Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў
(г. Мінск, Беларусь)

# Вядучыя кірункі сучаснага беларускага мастацтва і перспектывы іх развіцця

Напачатку новага дзесяцігоддзя XXI ст. неабходна аб'ектыўна вызначаць асноўныя здабыткі і задачы мастацкага працэсу. У Беларусі склалася больш за стагоддзе бесперапынная практыка творчага развіцця. Гэта — не вынікі дзейнасці асобнай групы мастакоў, але шматлікай іх супольнасці. З ліку сучасных мастакоў можна сфарміраваць не адну «творчую зборную», якія могуць па-наватарску прадстаўляць нашу нацыянальную культуру на любым міжнародным узроўні. Таму дадзеная публікацыя закранае характарыстыку не столькі асобных удалых артэфактаў, але акцэнтуе ўвагу на кірунках, якія аб'ядноўваюць многіх вядучых аўтараў.

Так склалася, што беларускае мастацтва ў перыяд свайго нацыянальнага станаўлення ў 1920-х гг. было арыентавана ў асноўным на два полюсы: нацыянальна-асветніцкі і сацыяльна-ідэялагічны. Ужо на Першай Усебеларускай выставе канца 1925 — пачатку 1926 гг., якая была прысвечана 400-годдзю беларускага кнігадрукавання і 20-годдзю Першай пралетарскай рэвалюцыі 1905 г., былі вызначаны тэматычныя і адпаведныя ім стылістычныя прыярытэты. Па-рознаму складаліся адносіны ў культурным жыцці да гэтых прыярытэтаў. Сюжэтна-тэматычныя кампазіцыі на ідэйна значныя тэмы доўгі час дамініравалі і былі звязаны з высокімі прафесійнымі патрабаваннямі да іх аўтараў. У спаборніцтве за лідарства перамагалі непараўнальныя майстры з моцным характарам і вялікім



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мастацкім патэнцыялам. Але нельга не заўважыць, што тэмы для іх самавыражэння былі дастаткова завужаныя сацыяльным заказам.

Нацыянальна-сканцэнтраваныя мастакі далёка не заўсёды маглі атрымаць своечасовае прызнанне, працавалі больш на ўласным, грамадскім энтузіязме, чым з надзеяй на афіцыйную падтрымку. Напрыклад, да канца свайго жыцця ў Нясвіжы пражыў таленавіты вучань Ф. Рушчыца М. Сяўрук, а толькі ў 2000-х гг. яго юбілейныя персанальныя выстаўкі былі на належным узроўні арганізаваны ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі. Шэраг выставак асветніцкага характару быў праведзены ў канцы 1970-х — 1980-х гг. у сувязі з юбілеямі Цёткі, М. Гусоўскага, В. Дуніна-Марцінкевіча, М. Багдановіча, Янкі Купалы, Якуба Коласа і інш. Але немагчыма цяпер аднавіць такую змястоўную нацыянальна-вартасную калекцыю, бо яна не была ў свой час мэтанакіравана набыта вядучымі музеямі краіны, разышлася па прыватных зборах, рассеялася па майстэрнях мастакоў, і многае, магчыма, цяжка ўжо і знайсці.

У 1990-х гг. культурная сітуацыя ў многім змянілася на карысць нацыянальнай тэматыцы на фоне відавочнага заняпаду сацыяльнага заказу «савецкага кшталту». Гэтая практыка назіраецца і па сённяшні дзень, прыносячы свае станоўчыя вынікі. Напрыклад, мастацкія творы У. Тоўсціка, В. Дамарада, У. Крываблоцкага, У. Даўгялы, У. Зінкевіча, В. Ціханава і многіх іншых майстроў, што ўзбагацілі эстэтычны выгляд Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Мірскага і Нясвіжскага замкаў, іншых буйных грамадскіх аб’ектаў, не могуць не ўражваць сваёй разнастайнай беларускай тэматыкай. Такім чынам, прафесійная творчасць, якая выконвае асветніцка-рэпрэзентатыўныя задачы, адпавядае высокім патрабаванням мастацкіх саветаў і мае неабходную афіцыйную падтрымку для свайго развіцця.



Маюць сваю творчую вагу і іншыя мастацкія кірункі, больш арыентаваныя на аўтарскія эксперыменты, на разнастайныя густы і захапленні шматлікіх рэцыпіентаў у Беларусі і за яе межамі. Сярод іх вельмі пашыраны так званы «гламурны стыль», які спавядае вытанчанае эстэтычнае харáство, дыстанцыруе гледача ад брутальных праяў рэальнасці, стварае ўтульнасць і камфорт у прыватным інтэр’еры і да інш. Бясспрэчным пачынальнікам такога кірунку на пачатку 1990-х гг. быў М. Селяшчук і яго блізкія паплечнікі. Цяпер вельмі шмат розных беларускіх мастакоў сярэдняга і малодшага пакаленняў прытрымліваюцца такіх эстэтычных пазіцый, і гэта з’ява перастае адназначна задавальняць. Бо яна можа прывесці да значнага адрыву ад пачуцця «пульсу рэальнасці», а значыцца адставання, у цэлым выдатнай беларускай школы ад мэт творчага лідарства

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў еўрапейскім рэгіёне, дзе ад мастакоў патрабуецца смелы і нават радыкальны эксперымент, які часта парушае камерны эстэтычны камфорт.

Спелай творчай з'явай у сучаснай беларускай творчасці можна лічыць кірунак неасюррэалізму, які ў еўрапейскім мастацтве пэўны час быў у цяні розных амерыканскіх нетрадыцыйных «arts», але цяпер набывае новае дыханне. Пазбаўлены крайняга абсурдызму ён, тым не менш, характарызуецца наяўнасцю паэтызавана-ірацыянальных метафар, якія рухаюць творчыя пошукі і прыводзяць да новых вобразных адкрыццяў. Сярод яго беларускіх першапраходцаў — Г. Скрыпнічэнка, С. Малішэўскі, К. Качан, Ю. Якавенка і інш. Яны злучылі ў сваім стылі ўзоры нацыянальнай гісторыі і сучаснасці, асабістых суб'ектыўных перажыванняў з неакрэслена-загадкавай вобразнай прасторай. Шматзначнае сучаснае светаасэнсаванне нашых сучаснікаў падштурхоўвае творцаў гэтага стылю «пераблытваць» падсвядомыя і аб'ектыўныя пачаткі ў сваіх творах. Неабмежаваныя магчымасці ірацыянальнай форматворчасці бачаць для сябе ў гэтым напрамку беларускія мастакі-тэкстыльшчыкі, якія правялі ў сёлетнім чэрвені Першы пленэр мастацтва тканіны «Метамарфозы і метафары» ў Мінску на чале з Л. Пятруль, В. Коневай, Ю. Зеляной і інш. Такім чынам, рэчышча такога неардынарнага кірунку пашыраецца і бачыцца вельмі запатрабаваным на футурыстычна доўгі час.

Кірунак геаметрычнай абстракцыі вельмі адпавядае цяпер сапраўднаму прарыву нашай сучаснай архітэктуры буйных грамадскіх аб'ектаў з яе ўстаноўкамі да фарміравання сінтэзу мастацтваў. У гэтым сэнсе эпатажныя прэцэдэнты архітэктурна-жывапіснага мадэрнізму стварае С. Кірушчанка. Адзін з самых буйных яго праектаў — выстаўка «Метабалізм жывапіснай прасторы» (2012) выклікала гарачыя спрэчкі апанентаў і прыхільнікаў. Тым не менш, яна стала сапраўдным допінгам для падрыхтоўкі да 100-годдзя славутага «Чорнага квадрата» К. Малевіча, што немагчыма не адзначыць творчымі навацыямі ў 2015 г.

Вялікі і нават не да канца выяўлены патэнцыял можна бачыць і ў такім невычэрпна-беларускім стылі, як неасімвалізм. У асноўным ён праяўляецца ў камерных жанрах жывапісу, у станковай і кніжнай графіцы. У жывапісным пейзажы яго прызнанымі майстрамі сталі В. Шкаруба, А. Грышкевіч, У. Кожух і шмат іншых мастакоў. Беларуская прырода, такім чынам, дае столькі ідэятворчых ідэй, што можна бясконца натхняцца яе «падгледжанымі таямніцамі». Натуральнае асяроддзе ў захаваным, нават пушчанскім выглядзе, якое знаходзіцца ў сваім беларускім «цэнтры Еўропы», дазваляе адчуць жывую повязь часоў,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

суіснаванне розных мікра- і макрапрасторавых вымярэнняў, рэальных і містычных сімвалаў. На гэтай арганічнай глебе і грунтуецца сімвалістычная творчасць, вельмі ўласцівая нашай нацыянальнай ментальнасці з яе схільнасцямі «растварэння ў прыродзе». У сучасных сімвалістаў таксама адчуваецца клопат пра захаванне вобразнага асяроддзя, якому пагражаюць экалагічныя катаклізмы, тэхнагенныя катастрофы і да інш. Неасімвалізм — выдатны шлях для асэнсавання і пошукаў шляхоў вырашэння многіх праблем сучаснай цывілізацыі, дзе непаўторнай асобе чалавека і яго натуральнаму асяроддзю яшчэ не надаецца першачарговая ўвага.

Прынцыпова новым адкрыццём у беларускім мастацтве з 1990-х і асабліва з 2000-х гг. становіцца дыялог культур. Сучасны свет ужо не можа быць адасобленым, і мастак павінен станавіцца своеасаблівым «мастом» для сапраўдных глабальных сувязей, пра якія раней нават і не ўяўлялася. Вельмі нямногім першапраходцам прыходзіцца ахвяравацца асабістым жыццёвым камфортам, каб трапіць на перадавыя пазіцыі глабальнай творчасці, асабліва калі дзеля гэтага прыходзіцца пераязджаць на доўгі час у заходнія мастацкія цэнтры. Ужо больш як 25 гадоў плённа працуе ў Парыжы славуты мінскі мастак Б. Забораў. Усё пачалося са змушанай эміграцыі, каб не згубіць свабоднага права на творчыя пошукі. А працягваецца як вялікі трыумф і міжнароднае прызнанне.



Мастак здолеў на самым шырокім творчым полі сцвердзіць духоўнае багацце, якое можа адчуць творца праз пранікненне ў мінулы час пры стартавай дапамозе фотаздымкаў 1-й паловы XX ст. Нельга не адчуць прыцягальнасць яго жывапісна-графічных вобразаў (увасобленых у непаўторнай аўтарскай тэхніцы), што знаходзяцца ў сваім унутраным свеце. Многія прататыпы — несумненна, прадстаўнікі нашага краю, або вельмі падобныя да іх еўрапейскія людзі: дзеці, мужчыны і жанчыны розных узростаў.

Такую ж глыбокую сімвалічнасць у мастака, як захавальнікі агульначалавечай архаічнай спадчыны, нясуць безлічныя адлюстраванні вясковых беларускіх хлявоў з саламянымі стрэхамі. Персанальная выстаўка Б. Заборава ў Дзяржаўнай Траццякоўскай галерэі ў Маскве, а затым ў Беларускім нацыянальным мастацкім музеі ў 2010 г. стала сапраўдным этапам у глабальным спасціжэнні параметраў духоўных пачаткаў, іх нацыянальных адметнасцей, блізкіх усяму свету.

Вельмі радуе таксама і сапраўдны парыжскі поспех мінскай даследчыцы і мастачкі І. Котавай. Дзесяць гадоў назад яна выехала ў Парыж, каб бліжэй пазнаёміцца з творчасцю беларускай эміграцыі, вучылася

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў Сарбоне, стала наведваць майстэрню Б. Заборава. Цяпер яна з'яўляецца выдатным майстрам парыжскіх краявідаў, у якіх адчуваецца яе прыналежнасць да новага этапу экспрэсіўнай «парыжскай школы», распачатай з 1910-х гг. М. Шагалам, Х. Суціным, С. Кікоіным і інш. Яе шматлікія матывы «Над дахамі Парыжа» сталі новым дыханнем для аднаўлення былых сувязей і фарміравання новага этапу беларуска-французскага творчага збліжэння.

У 2001 г. адбылася таксама памятная выстаўка 30 беларускіх творцаў у берлінскім міжнародным Доме мастакоў пад назваю «Дах». З усёй вялікай грамады ўдзельнікаў найбольшую сувязь з гэтым берлінскім цэнтрам, што носіць своеасаблівае найменне «Tacheles» (па-яўрэйску — шчырая размова) адчуў мінскі жывапісец А. Родзін. З таго часу ён трывала працуе там і стварыў па-сутнасці вялікую творчую пляцоўку, дзе разам з ім выстаўляюцца неардынарныя творцы з розных краін, у тым ліку — з Беларусі. Нягледзячы на ціск розных камерцыйных устаноў, якія імкнуцца авалодаць творчым цэнтрам у мэтах сваёй фірмы, мастак актыўна працуе і гуртуе вакол сябе моцных духам аднадумцаў.

Падсумоўваючы прыведзеныя прыклады неабходна вызначыць, што беларускае мастацтва за мінулыя 20 гадоў прайшло вялікую дыстанцыю да творчай разнастайнасці, свабоды мастацкага выбару ў пошуках стылю і тэматыкі. Поруч з адказнымі дзяржаўным заказамі на нацыянальную тэматыку мастакі імкнуцца да разнастайных эксперыментаў у сучасных стылях, сярод якіх можна вызначыць неасюррэалізм, неасімвалізм, абстракцыянізм, гламурны стыль і інш. Асаблівае мадэрнізатарства бачыцца ў пашырэнні творчага міжнароднага дыялогу культур, у якім сваё важкае слова ўносяць беларускія мастакі, якія працуюць за межамі краіны. Беларускае мастацтва, дзякуючы высокаму прафесіяналізму ў стане выканаць сваю вялікую наватарскую місію, якая звязана ў новым дзесяцігоддзі з далейшым самасцвярджэннем нацыянальнай культуры і пашырэннем глабальных творчых сувязей.



*Спіс выкарыстаных крыніц*

1. Мастацтва Беларусі. — М. : Галарт, 2010.
2. Борис Заборов : Государственная Третьяковская галерея. — Париж : Галерея Валуа, 2004.
3. Ірына Котава : Уяўны Парыж. — Мінск : Артыя Груп, 2010.
4. Пад адным дахам / Я. Шунейка // Праспект Незалежнасці. — Мінск : Галіяфы, 2012. — С. 91—112.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ